

Як абараніць сэрца?

СТАР. 5



Для каго ўзышла «Зара»

СТАР. 6



«Экспрапрыятар» у Бабруйску

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЖНІЎНЯ 2016 г. СЕРАДА № 162 (28272)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Сітуацыя кантралюецца

## Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прымаў з дакладамі вышэйшых службовых асоб краіны

**На сустрэчы кіраўніка дзяржавы з прэм'ер-міністрам Андрэем Кабяковым і старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Паўлам Калаурам абмяркоўвалася сітуацыя ў эканоміцы краіны. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця за мінулы перыяд 2016 года.**

Абмяркоўвалася таксама супрацоўніцтва Беларусі з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі па канкрэтных пытаннях. У іх ліку праект па рэканструкцыі аўтадарогі Мінск—Гродна, які рэалізуецца сумесна з Сусветным банкам. «Трэба ўсё рабіць, каб гэта супрацоўніцтва не спынялася. Для нас гэта вельмі выгаднае супрацоўніцтва, асабліва ў гэты перыяд», — адзначыў Прэзідэнт.

Андрэй Кабякоў далажыў, што ў той матрыцы задач, якая была вызначана кіраўніком дзяржавы, з сямі паказчыкаў выкананы адзін, але вельмі важны. Гэта паказчык інфляцыі. Ва ўрадзе разлічваюць, што інфляцыю ў 2016 годзе, як і планавалася, удасца ўтрымаць у межах 12%.

Эканоміка краіны паступова вяртаецца на траекторыю аднаўлення эканамічнага росту. Па пераважнай большасці паказчыкаў маецца станоўчая дынаміка, якая характарызуе якасныя змены ў эканоміцы.

Прэзідэнт падрабязна праінфармаваны аб сітуацыі на знешніх рынках, суадносінах экспарту і імпарту, плацежным балансе краіны. Абмеркаваны праблемныя пытанні, якія тычацца функцыянавання дзяржпрадпрыемстваў. Разгледжана выкананне праграмных мер па скарачэнні перакрыжаванага субсідавання ў сферы ЖКГ.

Акрамя таго, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур далажыў кіраўніку дзяржавы аб сітуацыі на валютным рынку і ў банкаўскім сектары. Нягледзячы на зніжэнне экспарту ў вартасным выражэнні, урад і Нацбанк разам з банкаўскай сістэмай прынялі адпаведныя меры, якія дазволілі істотным чынам стабілізаваць сітуацыю на валютным рынку.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу ўрада і Нацбанка, а таксама іншых банкаў на неабходнасць прыкласці адпаведныя намаганні для захавання належнай рэсурснай падтрымкі непасрэдна для крэдытавання рэальнага сектара эканомікі.

Прэзідэнт таксама падтрымаў прапанову ўрада аб увядзенні з 1 кастрычніка безнаяўных жыллёвых субсідый для частковай кампенсацыі платы за жыллёва-камунальныя паслугі, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Праект адпаведнага ўказа быў прадстаўлены Аляксандру Лукашэнку. Разлічваць на падтрымку змогуць сем'і, дзе аплата жыллёва-камунальных паслуг будзе перавышаць устаноўлены працэнт ад сукупнага даходу. Для гараджан гэта выдаткі больш за 20% у сукупным даходзе, а для сельскай мясцовасці — 15%, растлумачыў Андрэй Кабякоў.

У цэлым Прэзідэнт патрабуе, каб урад, плануючы нейкія рашэнні, якія могуць паўплываць на жыццёвы ўзровень насельніцтва, адрасным чынам у дачыненні да канкрэтных катэгорый грамадзян прадугледжваў нівелюючыя меры, дзейнічаў у рамках канцэпцыі сацыяльнай дзяржавы.

* * *

Аляксандр Лукашэнка заслухаў таксама даклад генеральнага пракурора Аляксандра Канюка аб стане крымінагеннай сітуацыі і рабоце органаў пракуратуры.

На мерапрыемстве таксама прысутнічалі прадстаўнікі іншых сілавых структур, кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта і дзяржсакратарыята Савета бяспекі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, пашыраны фармат мерапрыемства звязаны з глыбокай рэформай у праваахоўнай сістэме, якая нядаўна адбылася ў Беларусі. Як было адзначана па выніках даклада, у дзейнасці пракуратуры маецца тэндэнцыя ўсё большага пераходу пракурорскага нагляду ў эканамічную сферу. Прэзідэнт у цэлым станоўча ацаніў стан спраў у органах пракуратуры. Разам з тым, даручана ліквідаваць асобныя недахопы.

Абмеркаваны і некаторыя кадравыя пытанні, падрыхтоўка да правядзення ў Мінску ў пачатку верасня каардынацыйнай нарады генеральных пракурораў краін СНД.

Што тычыцца крымінагеннай сітуацыі, то ў параўнанні з мінулым годам яна практычна не змянілася. Разам з тым, у якасці станоўчага моманту адзначаецца меншая колькасць забойстваў. І ў цэлым у апошнія гады мае месца тэндэнцыя скарачэння злачыннасці.

XXIII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА РАГАЧОЎ 2016

# Прыемныя клопаты

## ПАДРЫХТОЎКА ДА СВЯТА НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ



Майстар-страхар Аляксандр ЛАТУШКА — жыхар сталіцы, працуе на ўзвядзенні даху царкоўнапрыходскай школы праваслаўнага храма Аляксандра Неўскага ў Рагачове.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рагачоў сёння не пазнаць. Ён падобны на вялізны мурашнік. Здаецца, што літаральна ўсе жыхары выйшлі на вуліцы, каб аднавіць райцэнтр да Дня беларускага пісьменства. Тут ужо шмат зроблена: абноўлены важныя сацыяльныя і культурныя аб'екты. Горад змяняецца на вачах, гавораць нават тыя, хто тыдзень не быў у Рагачове. Штодзень вядуцца будаўніча-мантажныя работы на аўтамагістралях, ідзе рамонт дарожнага пакрыцця вуліц. Ужо добраўпарадкаваны вадаём на скрыжаванні вуліц Кірава і Бабруйскай, тэрыторыя парку, праведзены капітальны рамонт фасадаў многіх дамоў, будынкі пошты, рэдакцыі раённай газеты... Гатоўнасць горада да свята ацэньваецца на 90%. СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Паколькі ўласных сродкаў у прадпрыемстваў недастаткова, сродкі і магчымасці бюджэту вельмі абмежаваныя, крэдытныя рэсурсы абмежаваныя і дарагія, таму выхад бачыцца ў прамых замежных інвестыцыях. Гэта ключавое пытанне развіцця эканомікі. На жаль, у нас мала практычнага руху па гэтым пытанні. Усе разважаем, гаворым правільна, а калі паглядзець, то інвестыцыі ў асноўны капітал за шэсць месяцаў бягучага года скараціліся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Доля замежных інвестыцый — усяго 4,9 працэнта. Неабходна прымаць меры для выпраўлення існуючай сітуацыі і актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9421 ▲ |
| Еўра | 2,2030 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0299 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0767 ▲ |

■ Жніво-2016

# Зямлю не падманеш

## Чаму формула «Больш пасеем — больш пажнём» спрацоўвае не заўсёды

**Навукоўцы і аграрыі ў адзін голас адзначаюць, што спрачацца са зменлівым надвор'ем з года ў год становіцца ўсё больш складана. Але ў бітве за ўраджай ні тыя, ні іншыя не хочуць здаваць пазіцыі. Пра гэта сведчаць і вынікі ўборачнай кампаніі, якая сёння практычна падышла да свайго лагічнага завяршэння. Нягледзячы на засуху, пылавыя буры і нераўнамернае размеркаванне ападкаў, сёлета, паводле папярэдніх вынікаў, удалося сабраць каля 7 млн тон збожжавых і зернебабовых культур. Разам з тым гэты паказчык прыкметна ніжэйшы за ўзровень мінулага года, калі валавы збор збожжа склаў больш за 8,5 млн тон. Падрабязней аб ходзе і выніках уборачнай кампаніі і пра тое, як селекцыя змагаецца з кліматычнымі зменамі, карэспандэнту «Звязды» расказаў доктар сельскагаспадарчых навук, генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук Фёдар ПРЫВАЛАЎ.**



***— Фёдар Іванавіч, з пункту гледжання аграрнай навукі, як вы ацэньваеце сёлетнюю ўборачную кампанію?***

— Вучоныя навукова-практычнага цэнтра па земляробстве яшчэ 1 ліпеня 2016 года рабілі прагноз датычна ўборачнай кампаніі. Наведаўшы гаспадаркі ўсіх абласцей краіны, мы прыйшлі да высновы, што ўраджай збожжа складзе прыблізна 7,1 млн тон. Як відаць, ён сёння практычна выкананы. На выніку ўборачнай кампаніі негатыўна паўплываў шэраг фактараў, да якіх можна аднесці меншае выкарыстанне азотных і іншых угнаенняў, а таксама меншае прымяненне сродкаў аховы раслін. Капрызы надвор'я таксама адыгралі сваю ролю.

Цяжкасці з угнаеннямі сёння відавочныя — крызіс сусветнай эканомікі адмоўна ўплывае на сітуацыю ў Беларусі: гаспадаркі атрымлівалі менш крэдытных рэсурсаў. СТАР. 3

■ Жыллё

# ПОШУК СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»

Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць захаванне сённяшніх цэннікаў мінімум да пачатку зімы. Праўда, яны адзначаюць, што з сярэдзіны ліпеня арэнда ўжо падаражэла на 5-9%



**Звычайна з сярэдзіны ліпеня і да другой дэкады верасня ў Мінску назіраўся павышаны попыт на здымныя кватэры. Аднак у апошнія некалькі гадоў падобная тэндэнцыя ўжо не працавала, бо ў сектары прыватнай арэнды існавала максімальная колькасць варыянтаў свабодных кватэр, якія наш рынак «пераварыць» ужо не мог. У гэты час цэны на здымнае жыллё ў валютным эквіваленце выключна зніжаліся. Пакуль зніжаліся. Летам сёлета стаўкі прыватнай арэнды нават крыху падраслі і з сярэдзіны жніўня цалкам стабілізаваліся. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік аддзела арэнды кампаніі «Твая сталіца. Агенцтва нерухомасці» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.** СТАР. 3

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Саркозі зноў збіраецца ісці на выбары



Экс-прэзідэнт Францыі Нікаля Саркозі мае намер вылучыць сваю кандыдатуру на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах у гэтай краіне, паведамляюць інфармагенцтвы. Такімі планамі Саркозі падзяліўся ў новай кнізе «Усё для Францыі», урыўкі з якой аўтар апублікаваў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Facebook. Ён канкрэтызуе, што вырашыў стаць кандыдатам у прэзідэнты Францыі на выбарах 2017 года. Адзін з былых кіраўнікоў Пятай рэспублікі адзначыў, што адчувае ў сабе сілы весці перадвыбарную барацьбу ў складаны для Францыі гістарычны перыяд.

## Колькасць ахвяр выбуху на вяселлі ў Турцыі павялічылася да 54 чалавек

Колькасць загінулых у тэрарыстычнай атацы, якая адбылася 20 жніўня падчас вясельнай цырымоніі на поўдні Турцыі, павялічылася да 54 чалавек. Раней паведамлялася пра 51 загінулага. Паводле слоў ананімнай крыніцы, яшчэ тры чалавекі памерлі ад атрыманых ран у шпіталі. Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган паведаміў, што да выбуху мае дачыненне тэрарыст-смяротнік ва ўзросце 12-14 гадоў. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні свайму турэцкаму калегу Рэджэпу Таіпу Эрдагану.

## Суд адмовіў расійскім паралімпійцам ва ўдзеле ў Гульнях-2016

Спартыўны арбітражны суд адхіліў іск Паралімпійскага камітэта Расіі (ПКР) і не дапусціў расійскіх спартсменаў да Гульняў-2016 у Рыа-дэ-Жанэйра. У судзе прызналі законным рашэнне кіраўніка Міжнароднага паралімпійскага камітэта Філіпа Крэйвена аб прыпыненні членства ПКР у арганізацыі і нядопуск зборнай Расіі да Паралімпійскіх гульняў. Такім чынам, расійская каманда ў поўным складзе не зможа прыняць удзел у спаборніцтвах. Паралімпійскія гульні 2016 года пройдуць у Рыа-дэ-Жанэйра з 7 па 18 верасня.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## Венгерскі дэпутат прапанаваў адпуджваць мігрантаў свінымі галовамі



Паплечнік прэм'ер-міністра Венгрыі і еўрадэпутат Дзьёрдзь Шофлін прапанаваў зусім незвычайнае рашэнне праблемы бежанцаў. Як паведамляюць СМІ са спасылкай на The Independent, ён заявіў, што абмежаваць паток бежанцаў у еўрапейскія краіны можна шляхам развешвання на межах свіных галоў, якія будуць адпуджваць мігрантаў-мусульман. На сваёй старонцы ў Twitter ён размясціў запіс, дзе расказаў, што галава свінні будзе стрымліваць значна больш эфектыўна, чым малюнкі чалавека. Паведамляецца таксама, што гэты запіс ужо выдалены, бо палітыка падверглі жорсткай крытыцы, назваўшы яго заяву неанацысцкай і агіднай. Варта адзначыць, што аўтар нашумелай прапановы адмовіўся прасіць прабачэння за свае словы, патлумачыўшы гэта тым, што ён нікога не зневажаў. Нагадаем, што ў кастрычніку ў краіне пройдзе рэферэндум, на якім жыхары павінны будуць выказаць сваю згоду ці нязгоду з палітыкай ЕС па абавязковым рассяленні бежанцаў.

КОРАТКА

Замежнікам для наведвання Аўгустоўскага канала ўстанаўліваецца бязвізавы ўезд у Беларусь. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 23 жніўня.

**Вадзіцелі ў Беларусі павінны будуць днём ездзіць з блізкім святлом фар з 25 жніўня па 5 верасня.**

Падраздзяленні Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) будуць задзейнічаны ў міратворчых місіях ААН.

**Беларуская група «Дразды» дасць дабрачынны канцэрт на глыбіні 420 м пад зямлёй. Канцэрт «У глыбіні калійных руд» адбудзецца 27 жніўня ў салігорскіх шахтах, а атрыманыя ад незвычайнага выступлення грошы будуць накіраваны на дапамогу дзецям.**

Прыпынак аўтобусаў № 31 і № 172Э каля станцыі метро «Уручча» ў Мінску ў напрамку пасёлка Калодзішчы з 24 жніўня пераносіцца на пляцоўку для прыгарадных маршрутаў каля станцыі метро «Уручча».

■ Рэпартаж-эксперымент

# Шасцікласнікі выбіраюць макасіны

## Наколькі густы і патрэбы дзяцей супадаюць з густамі і магчымасцямі бацькоў

**Сабраць дзіця ў школу — гэта хоць і прыемны, але ўсё ж такі стрэс для бацькоў. А калі сям'я шматдзетная, то апошнія тыдні жніўня нагадваюць спрынтарскі забег: трэба і фінансава паднапружыцца, і намаганняў прыкласці мноства, каб абавязкова дагадзіць кожнаму. Разам з сям'ёй Куноўскіх карэспандэнты «Звязды» адправіліся па пакупкі ў адзін з самых буйных сталічных універмагаў — ГУМ.**

У Дзмітрыя і Галіны Куноўскіх трое дзяцей: пятнаццацігадовая Ганна (10 клас), адзінаццацігадовы Міхаіл (6 клас) і чатырохгадовая Ксенія. СТАР. 4



Выбар бацькоў.



Выбар Міхася.

Фота Надзеі БУЖАН.